**Н.А.Ляйко**, *дацэнт*
**Набіль Хаддад**, *аспірант*

# НАРМАТЫЎНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ КАТАЛАГІЗАЦЫІ

Пры навуковай (аналітычна-сінтэтычнай) апрацоўцы дакументаў вялікую ролю адыгрываюць уніфікацыя і стандартызацыя працэсаў бібліяграфічнага апісання і індэксавання дакументаў. Яны садзейнічаюць павышэнню якасці і эфектыўнасці выкарыстання каталогаў.

Разам з тым прыходзіцца канстатаваць, што ў кожнай бібліятэцы ёсць свае асаблівасці, з якімі прыходзіцца лічыцца пры навуковай апрацоўцы дакументаў, арганізацыі і вядзенні сістэмы каталогаў і картатэк. Перш за ўсё гэта залежыць ад аб'ёму і саставу бібліятэчнага фонду. У прыватнасці, розныя віды выданняў (ноты, грампласцінкі, стандарты, патэнты, аўтарскія пасведчанні, справаздачы аб навукова-даследчай рабоце, аўдыёвізуальныя матэрыялы, картаграфічныя выданні) маюць свае асаблівасці пры апрацоўцы дакументаў і арганізацыі каталогаў. Пры арганізацыі каталогаў даводзіцца ўлічваць таксама профіль абслугоўваемага раёна і запыты спажыўцоў інфармацыі.

Нягледзячы на гэта, працэсы арганізацыі бібліятэчных фондаў і каталагізацыя дакументаў у бібліятэках розных тыпаў павінны ажыццяўляцца на аснове адзіных прынцыпаў, метадаў і прыёмаў. Гэта дасягаецца з дапамогай прымянення абавязковай для выкарыстання сістэмы нарматыўна-метадычных дакументаў, якія рэгламентуюць работу ў галіне каталагізацыі стандартаў, аўтарскіх табліц, табліц класіфікацыі і інструктыўна-метадычных матэрыялаў.

Стандарт — гэта нарматыўна-вытворчае выданне, якое ўтрымлівае комплекс нормаў, правіл і патрабаванняў да аб'екта стандартызацыі, якія ўстанаўліваюцца на аснове дасягненняў навукі, тэхнікі і перадавога вопыту і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зацвярджаюцца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам. Стандартызацыя ў галіне бібліятэчнай справы разглядаецца як "устанаўленне ў дзяржаўным парадку нормаў, правілаў, патрабаванняў да розных аб'ектаў бібліятэчнай справы" (Библиотечное дело: терминологический словарь / РГБ. — 3-е перераб. и доп. изд. — Мн.: Бел. ун-т культуры, 1977. — С.115). Прымяненне стандартызацыі ў галіне бібліятэчнай справы і бібліяграфіі з'яўляецца важнейшым сродкам удасканалення бібліятэчнага і даведачна-інфармацыйнага абслугоўвання ў бібліятэках, садзейнічае рацыянальнаму выкарыстанню бібліятэчна-бібліяграфічных рэсурсаў, шырокаму ўкараненню сучасных тэхналогій вылічальнай тэхнікі, рэпраграфіі і іншых сродкаў у работу бібліятэк і органаў інфармацыі.

Асаблівае значэнне уніфікацыя і стандартызацыя маюць у галіне каталагізацыі. Зыходзячы са стандартызацыі ў бібліятэчнай справе, стандартызацыю ў галіне каталагізацыі можна вызначыць як "устанаўленне ў дзяржаўным парадку і прымяненне адзінай тэрміналогіі, уніфікаваных і адзіных нормаў, правіл, метадаў і патрабаванняў, заснаваных на дасягненнях навукі, тэхнікі і перадавога вопыту, на розныя працэсы каталагізацыі: складанне бібліяграфічнага апісання, сістэматызацыю, прадметызацыю, арганізацыю, вядзенне і рэдагаванне каталогаў".

Аб'ектам стандартызацыі ў каталагізацыі з'яўляюцца тэрміны, азначэнні, патрабаванні, правілы, метады, працэсы, якія шмат разоў паўтараюцца ў бібліятэках, кніжных палатах, выдавецтвах, органах інфармацыі і іншых установах.

Стандартызацыя ў галіне каталагізацыі садзейнічае павышэнню якасці і эфектыўнасці выкарыстання каталогаў, аператыўнаму ўкараненню ў іх дзейнасць новых матэрыялаў, выкарыстанню цэнтралізаванай каталагізацыі, мадэрнізацыі тэхналагічных працэсаў (бібліяграфічнага апісання і індэксавання дакументаў, арганізацыі, вядзення і рэдагавання як традыцыйных, так і электронных

каталогаў), уніфікацыі тэрміналогіі, набліжэнню да міжнародных стандартаў. На сучасным этапе стандартызацыя з'яўляецца асновай для замацавання цеснай сувязі бібліятэк з органамі НТІ і выдавецтвамі пры зборы, апрацоўцы, прапагандзе і выкарыстанні розных крыніц інфармацыі, асабліва ў сувязі з прымяненнем аўтаматызаванай інфармацыйна-бібліятэчнай сістэмы (АБІС), стварэннем зводных электронных каталогаў.

Гарантыяй уніфікацыі каталагізацыі з'яўляюцца дзяржаўныя стандарты на бібліяграфічнае апісанне і індэксаванне дакументаў, адпаведнасць іх міжнародным стандартам.

У вучэбнай і навуковай літаратуры прыводзяцца звесткі аб тым, што стандартызацыя ў галіне каталагізацыі ў СССР з'явілася ў 60-х—пачатку 70-х гадоў XX ст. (Библиотечные каталоги: Учебник для студентов библ. фак-тов ин-тов культуры / Под ред. Г.И.Чижиковой. — М.: Книга, 1977. — С.37—40; Мотульский Р.С. Современное состояние стандартизации в области библиотечного дела и перспективы ее развития в Республике Беларусь // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва. — 1993. — Вып. 2. — С.25—29; Хренкова А.А. Стандартизация в области библиотечного дела и библиографии: Состояние и перспективы // Сов. библиотековедение. — 1981. — № 2. — С.74—87), а ў краінах Заходняй Еўропы, у прыватнасці Германіі, значна раней, у 20-х—пачатку 30-х гадоў. А.М.Стахевіч у артыкуле "У истоков зарождения стандартизации в библиотечном деле" (Библиотековедение. — 1998. — № 8. — С.45—54) сцвярджае, што патрэбнасць у першапачатковым развіцці стандартызацыі ў галіне каталагізацыі з'явілася ў канцы XIX — пачатку XX ст. На наш погляд, гэтае палажэнне заслугоўвае ўвагі. У кнізе Ю.М.Сталярова "Ю.В.Григорьев" (М.: Кн.палата, 1989. — 222 с.) гэтыя разважанні дапаўняюцца прыкладамі, калі з'явіліся першыя інструкцыі па каталагізацыі. Разам з тым, хоць гэта былі яшчэ не стандарты, а толькі інструкцыі, яны ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

далейшым разам з "Едиными правилами описания произведений печати для библиотечных каталогов" (М.; Л., 1949—1970. — Вып. 1—8) сталі тым падмуркам, на аснове якога былі створаны першыя дзяржаўныя стандарты. У 70 - 90-я гады стандартызацыя ў Расіі паспяхова развіваецца, набліжаецца да міжнародных стандартаў. Аб гэтым сведчаць такія стандарты, як "ГОСТ 7.1—84. Библиографическое описание документа. Общие требования и правила составления" і "ГОСТ 7.59—90 Индексирование документов. Общие требования к систематизации и предметизации".

Асаблівае значэнне для развіцця стандартызацыі, у тым ліку і ў галіне каталагізацыі, мае Міжнародная арганізацыя па стандартызацыі — International Organizaion for Standartization (ISO), якая была створана ў 1946 г.

Для каталагізацыі вялікае значэнне мае ТК 46 "Документизация", асноўным накірункам якога з'яўляюцца: стандартызацыя па бібліятэчнай справе, дакументацыі і інфармацыйных цэнтрах, службах індэксацыі і анатацыі, архівах, выдавецкай справе. Асаблівае значэнне на сучасным этапе мае распрацоўка міжнародных стандартаў па камунікатыўным фармаце баз даных, кодах моў і іх транскрыпцыі, тэрміналагічных і іншых стандартах. (Пералік дзеючых стандартаў ISO ў галіне бібліятэчнай справы і бібліяграфіі гл.: Мотульский Р.С. Современное состояние стандартизации в области библиотечного дела и перспективы ее развития в Республике Беларусь // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва. — 1993. — Вып. 2. Дадатак. — С.25—29.)

Вялікае значэнне для каталагізацыі ва ўсіх краінах маюць міжнародныя бібліятэчныя арганізацыі (МБА).

Па характары прадстаўленых арганізацый і іх членаў існуюць урадавыя (да іх адносіцца ЮНЕСКА) і грамадскія МБА (да іх адносіцца большасць арганізацый, у тым ліку буйнейшыя з іх IFLA).

Міжнародная федэрацыя бібліятэчных асацыяцый і ўстаноў (International Federation of Library Associations and

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Institution (IFLA) заснавана ў 1927 г. Яна супрацоўнічае як з урадавымі, так і з грамадскімі арганізацыямі, ахоплівае ўсе аспекты тэорыі і практыкі бібліятэчнай справы.

Неабходна адзначыць значную ролю IFLA ў станаўленні і развіцці каталагізацыі. Менавіта пад кіраўніцтвам IFLA пачалася распрацоўка міжнародных правіл, у якіх было уніфікавана фарміраванне загалоўка ў бібліяграфічным запісе.

На Парыжскай канферэнцыі ў 1961 г. былі ўдакладнены такія пытанні, як "Міжнародны спіс нацыянальных аўтараў для выкарыстання ў каталагізацыі", "Спіс апісанняў публікацый вышэйшых заканадаўчых і міністэрскіх органаў еўрапейскіх краін" і інш. Асабліва вялікая роля IFLA ў падрыхтоўцы серыі правіл бібліяграфічнага апісання, якія з'яўляюцца асновай любога віду інфармацыі. Ужо распрацавана шэсць ISBD (Бурн Р. Универсальный библиографический учет: теория и практика: Создание и организация новой программы ИФЛА // Библиотековедение и библиография за рубежом. — М., 1989. — Вып. 121. — С.5).

Для нашага даследавання ўяўляе цікавасць дзейнасць IFLA па разглядзе пытанняў "універсальнага бібліяграфічнага ўліку і Міжнароднай праграмы MARC".

Па даных Internet, сярод асноўных мэт праграмы УБУ/МПМ на сучасным этапе з'яўляюцца:

— каардынацыя дзейнасці, накіраванай на развіццё аўтаматызаваных сістэм і ўдасканаленне стандартаў у галіне бібліяграфічнага ўліку на нацыянальным узроўні;

— развіццё міжнароднага абмену бібліяграфічнай інфармацыяй, кантроль за выкарыстаннем патрабаванняў стандартаў і машыначытальны фармат;

— садзейнічанне распаўсюджванню фармата UNIMARC, каардынацыя дзейнасці спецыялістаў па яго ўдасканаленні і ажыццяўленні кантролю за яго выкарыстаннем.

Распрацаваная IFLA серыя дакументаў — Міжнародныя стандартныя бібліяграфічныя апісанні (ISBD), якія



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэгламентуюць тэкст і структуру бібліяграфічнага апісання, стала базай для стварэння і дапрацоўкі нацыянальных стандартаў.

Фармат UNIMARC, які рэкамендаваны IFLA ў якасці міжнароднага абменнага машыначытальнага фармата, прызначаны быць фарматам-пасрэднікам. Пачынаючы з 1990-х гадоў ён выкарыстоўваецца ў якасці канвертаў у краінах Усходняй Еўропы і СНД, у прыватнасці Чэхіі, Расіі, на Украіне і інш. Так, больш за 10 гадоў у Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы выкарыстоўваюцца RUSMARC, а ў Рэспубліцы Беларусь распрацаваны Беларускі нацыянальны MARC — сумяшчальны абменны фармат бібліяграфічных запісаў BELMARC для інфармацыйнага забеспячэння зводнага электроннага каталога бібліятэк Беларусі (Кравцова Л., Федорина А. Проблемы создания национального обменного формата // Бібліятэчны свет. 1997. — № 3. — С.9—10).

У Сірыйскай Арабскай Рэспубліцы пакуль няма распрацаваных нацыянальных стандартаў. У бібліятэках выкарыстоўваюцца стандарты арганізацыі ALEKCO.

Міжнароднае супрацоўніцтва і аўтаматызацыя каталагізацыйных працэсаў на сучасным этапе патрабуюць высокага ўзроўню стандартызацыі ў галіне каталагізацыі. На думку спецыялістаў, важнейшымі стандартамі ў галіне каталагізацыі павінны быць: фармат MARC, адзіныя міжнародныя аўтарытэтныя файлы, адзіная тэрміналогія (Клим И.Л. Каталогизация на пороге III тысячелетия // Библиотеки и ассоциации в меняющемся мире: новые технологии и новые формы сотрудничества: Материалы конф. Судак, 6—14 июля 1998 г. — М., 1998. — Т. 2. - С.705. — 5-я юбилейная международная конференция “Крым — 98”).

Для ўдасканалення каталагізацыі ў Сірыі неабходна прымяненне сучасных тэхналагічных працэсаў, новых формаў і метадаў. У сувязі з тым, што гэта магчыма толькі пры наяўнасці адпаведнай нарматыўна-рэгламентуючай дакументацыі, патрэбна пры органах кіравання бібліятэчнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

справай Сірыі стварыць службы, якія будуць ажыццяўляць распрацоўку нацыянальных стандартаў. Наяўнасць стандартызацыі ў Сірыі дасць магчымасць ажыццявіць цэнтралізаваную каталагізацыю, што стане гарантам павышэння якасці і эфектыўнасці выкарыстання каталогаў спажыўцамі інфармацыі.

**Я.Л.Мархоцкі**, *прафесар*
**А.В.Палянская**, *дацэнт*

## УДАСКАНАЛЕННЕ НАВУЧАЛЬНАГА ПРАЦЭСУ Ў СІСТЭМЕ СТАНДАРТАЎ ВЫШЭЙШАЙ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ І МАСТАЦКАЙ АДУКАЦЫІ (курс "Асновы экалогіі")

З мэтай забеспячэння спрыяльных для існавання сучасных і будучых пакаленняў умоў дзяржава ставіць перад вышэйшай школай новыя задачы ў галінах экалагічнай адукацыі, выхавання студэнтаў. Адным з накірункаў у гэтай справе з'яўляецца ўдасканаленне методыкі выкладання курса "Асновы экалогіі" паводле стандартаў вышэйшай гуманітарнай адукацыі.

Выпрацоўка грамадзянскага стаўлення да навакольнай прыроды цесна звязана з фарміраваннем не толькі сістэмы ведаў, але і ўменняў, навыкаў арыентацыі ў навакольным асяроддзі. Метадалагічнай асновай авалодання сучаснымі экалагічнымі ведамі з'яўляецца дыялектычнае адзінства ў сістэме "чалавек — грамадства — прырода". Гэтыя веды павінны мець міжпрадметны характар, уключаць у сябе прыродазнаўча-навуковыя, грамадска-гістарычныя, сацыяльна-эканамічныя, тэхніка-тэхналагічныя, маральна-эстэтычныя сістэмы ўзаемадзеяння грамадства з прыродай.

У сучаснай навуцы паняцце экалогіі не трэба абмяжоўваць толькі біялагічным яго значэннем. Яно павінна характарызавацца адзінствам сацыяльных, эканамічных,